# Абітурыентам трэба пасляшацца з выбарам

- Аўтар:
- Надзея Нікалаева

- Грамадства, Адукацыя

**25 ліпеня — гарачы час для прыёмных камісій ВНУ. Заўтра канчаткова вызначыцца з выбарам месца навучання і будучай прафесіі павінны абітурыенты, якія прэтэндуюць на бюджэтныя месцы, а таксама абітурыенты, якія паступаюць на платную форму навучання на спецыяльнасці, дзе прадугледжаныя ўступныя іспыты.**



Фота: БДПУ

Прыёмныя камісіі ў апошні дзень прыёму дакументаў працуюць да 18.00. У рамках вызначанага для падачы дакументаў перыяду можна забіраць і перападаваць дакументы колькі заўгодна разоў. Можна забраць іх і аднесці ў іншую ВНУ, дзе ёсць больш шанцаў на паступленне. У многіх ВНУ і на факультэтах ёсць агульны конкурс, які прадугледжвае падачу дакументаў адразу на некалькі спецыяльнасцяў аднаго кірунку.

Назіраць за ходам падачы дакументаў у прыёмныя камісіі можна анлайн. Інфармацыя аб ходзе падачы дакументаў абнаўляецца кожныя тры гадзіны, а ў некаторых універсітэтах — у рэжыме рэальнага часу. Апошняе абнаўленне ў

дзень закрыцця прыёмных камісій адбудзецца ў 17 гадзін. Такім чынам у абітурыентаў будзе яшчэ гадзіна, каб сарыентавацца і падаць дакументы туды, дзе ім гарантавана хопіць балаў.

Для некаторых катэгорый абітурыентаў тэрміны падачы дакументаў іншыя. Так, на дзённую форму навучання па напрамках адукацыі «Сельская гаспадарка», «Ветэрынарыя», «Рыбная гаспадарка» і «Ахова працы» на бюджэт і платную аснову і па ўсіх спецыяльнасцях у Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь і Інстытуце пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь, а таксама на ваенных факультэтах і ваенным інстытуце за кошт бюджэтных сродкаў дакументы прымаюць з 17 да 27 ліпеня.

Абітурыентам трэба мець на ўвазе, што пастановай Міністэрства адукацыі вызначаны найбольш запатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці. Пры паступленні на іх без уступных іспытаў будуць залічвацца пераможцы (уладальнікі дыпломаў І, ІІ і ІІІ ступеняў) трэцяга (абласнога і Мінскага гарадскога) этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, школьныя медалісты і ўладальнікі дыпломаў аб сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі з адзнакай. Напрыклад, у БДУІР да найбольш запатрабаваных эканомікай былі аднесены пяць спецыяльнасцяў: «Мікра- і нанаэлектроніка», «Электронныя сістэмы і тэхналогіі», «Радыёсістэмы і радыётэхналогіі», «Нанатэхналогіі і нанаматэрыялы» і «Інжынерна-педагагічная дзейнасць (на завочнай скарочанай форме навучання)».

Дарэчы, ужо цяпер можна сказаць, што ў БДУІР сёлета будуць абноўлены папярэднія рэкорды па прахадных балах. Так, па стане на 12 гадзін 24 ліпеня на спецыяльнасці «Праграмная інжынерыя» факультэта камп'ютарных сістэм і сетак паўпрахадны бал быў 393, на «Электроннай эканоміцы» інжынерна-эканамічнага факультэта прахадны бал — 391, на спецыяльнасці «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» факультэта камп'ютарных сістэм і сетак паўпрахадны бал — 389, на факультэце інфармацыйных тэхналогій і кіравання на спецыяльнасці «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі» паўпрахадны бал — 387.

А тым часам у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце ўжо падводзяць першыя вынікі заключнага этапу прыёмнай кампаніі і з задавальненнем канстатуюць, што з кожным годам расце колькасць выпускнікоў профільных педагагічных класаў, якія вырашаюць звязаць сваю будучыню з прафесіяй настаўніка.

Так, у перыяд з 17 да 19 ліпеня ў БДПУ праходзілі прыём дакументаў і правядзенне сумоўяў у абітурыентаў — выпускнікоў профільных класаў педагагічнай накіраванасці. Дадзеная катэгорыя абітурыентаў мае права паступіць на педагагічныя спецыяльнасці на льготных умовах — без экзаменаў. З выпускнікамі праводзіцца гутарка, падчас якой прыёмная камісія можа выявіць аб'ём ведаў, атрыманых падчас вывучэння факультатыўнага курса «Уводзіны ў педагагічную прафесію», а таксама ацаніць матываванасць будучага студэнта.

Абітурыентаў і іх бацькоў па традыцыі сустракалі і падтрымлівалі ўдзельнікі студэнцкага клуба выпускнікоў педагагічных класаў «ПРОФіль+». У спецыяльна арганізаванай «Зоне ПРОФільнай падтрымкі» студэнты

ўніверсітэта дапамагалі педкласаўцам адчуць сябе больш упэўнена, расказвалі ім пра факультэты БДПУ, пра нюансы праходжання сумоўя і прэзентацыю свайго партфоліа.

Усяго за перыяд прыёмнай кампаніі ў рамках асноўнага прыёму падалі дакументы і прайшлі сумоўе 106 абітурыентаў з ліку выпускнікоў педагагічных класаў, а 27 выпускнікоў вырашылі паступаць на агульных падставах.

Варта нагадаць, што сёлета ў навучэнцаў педагагічных класаў з'явілася магчымасць пры паступленні ўзяць мэтавае накіраванне і пры гэтым скарыстацца льготай — замест уступных іспытаў прайсці сумоўе. 46 абітурыентаў-мэтавікоў яшчэ ў чэрвені былі залічаны ва ўніверсітэт. У цэлым у рамках прыёмнай кампаніі 2023 года сумоўе праведзена са 152 абітурыентамі з ліку выпускнікоў профільных класаў педагагічнай накіраванасці.

**Надзея НІКАЛАЕВА**